НА ЭКЗАМЕНАЦЫЙНАЙ ЛІНЕЙЦЫ

ПЕРАКЛІЧКА ФАКУЛЬТЭТАЎ

**ЮРФАК**

Дзяржаўны экзамен па гісторыі КПСС здалі студэнты VI курса вячэрняга аддзялення. Першымі атрымалі віншаванні старшыні дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі дацэнта Л. М. Калінковіча студэнты першай групы. Тут выдатныя адзнакі атрымалі М. Бандарэнка, В. Дайнека, А. Шелкапляс, В. Касц'янаў, добрыя — дзесяць чалавек, здавальняючыя — шэсць.

**ГІСТФАК**

Экзамен па англійскай мове. У групы студэнтаў другога курса аддзялення філасофіі гістфака (тут займалася 12 чалавек) ужо за некалькі дзён да экзамена настрой сапсаваўся — як ні як, а пяць чалавек не дапусцілі да здачы. У чым справа? Вінаваты самі студэнты, якія абыякава адносіліся да вывучэння замежнай мовы, а некаторыя з іх, як, напрыклад, Качаргін, Данілін, Пуцылеў, вельмі рэдка наведвалі і заняткі.

Не парадаваў гістфак і вынік тых, хто трымаў справаздачу. Веды ўсіх ацэнены толькі на здавальняюча.

Пачатак — не з лепшых!

**БІЯФАК**

Тры групы першакурснікаў біялагічнага факультэта здалі экзамен па вышэйшай матэматыцы. Выдатныя адзнакі з'явіліся ў залікоўках А. Нечыпарэнка, В. Бяляўскага, В. Бураўскага, К. Беляўскага, Г. Мардачовай, В. Літвінавай, Л. Ліпскай і многіх іншых.

**МАТФАК**

Паспяхова здалі экзамен па англійскай мове трэцякурснікі.

У гэтым годзе упершыню на экзамене ўведзена практыка перакладу арыгінальнага тэксту без слоўніка. Большасць студэнтаў паказала веданне лексікі, уменне працаваць са спецыяльнай літаратурай. У групе, якую вядзе выкладчык Я. Я. Шлапакова, з 15 чалавек пяць атрымалі «выдатна», толькі двое «здавальняюча», адзін, А. Бажко, — «нездавальняюча».

Лепшымі ў групе Т. Ф. Каванай былі Мікалай Мяцельскі і Наташа Сергіевіч. Яны выдатна справіліся з заданнямі.

**ХІМФАК**

На пытанне аб выніках экзамена па гісторыі КПСС на другім курсе вячэрняга аддзялення хімічнага факультэта адказаў выкладчык кандыдат гістарычных навук Рыгор Сцяпанавіч Маханёк:

— Усяго экзамен здавалі 63 студэнты. З гэтага ліку дзевяць атрымалі нездавальняючыя адзнакі, два адказалі на выдатна, дваццаць добра.

Чаму многа нездавальняючых?

Некаторыя студэнты гэтага курса не хадзілі ні на лекцыі, ні на практычныя заняткі. Іншай адзнакі яны і не маглі атрымаць. Патрабаванні прад'яўляюцца аднолькавыя да студэнтаў стацыянара і да студэнтаў вячэрняга аддзялення. Дыпломы яны атрымліваюць аднолькавыя, значыць, і веды вячэрнікаў павінны быць не горшымі чым студэнтаў стацыянара.

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 21 (712) ● Пятніца, 7 чэрвеня 1968 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XXI

## ГОСЦІ З ФРАНЦЫІ

**«Нам вельмі спадабалася гасціннасць і чуласць беларускіх сяброў». Гэтыя словы належаць адной французжанцы, якая разам з турыстычнай групай нядаўна наведала наш універсітэт.**

**Госці з Францыі азнаёміліся з універсітэтам, з яго мінулым і сучасным. Яны былі вельмі ўражаны тым, што з маленькага корпуса, як наш стары фізічны, вырас універсітэт, з яго вялізнымі будынкамі, са шматлікімі сучаснымі лабараторыямі і кабінетамі, з багатымі музеямі і бібліятэкай.**

**Французскія госці ўважліва праслухалі прамову рэктара універсітэта прафесара А. Н. Сеўчанкі аб мінулым і цяперашнім універсітэта, агледзелі ў бібліятэцы выстаўку французскай літаратуры ў перакладах на беларускую мову, літаратуру аб мастацтве Францыі.**

**К. ПАЧАТКЕВІЧ.**

# ДЗІЎНЫЯ КАНТРАСТЫ

Экзаменацыйная сесія ўвайшла ў сваю каляю. Прыйшла яна і на хімічны факультэт, на трэці курс. Першы экзамен, які патрэбна было вытрымаць трэцякурснікам — асновы навуковага атэізма. І трэба сказаць, што студэнты справіліся са сваёй задачай добра. З 138 праэкзаменаваных выдатныя веды паказалі 55 чалавек, 82 здалі экзамен на добра, і толькі адзін студэнт атрымаў здавальняючую адзнаку. Мы гутарым з выкладчыкам А. А. Кругловым.

— Скажыце, у чым сакрэт такіх поспехаў?

— Справа ў тым, што трэці курс выключна добрасумленна паставіўся да вывучэння навуковага атэізма. Усе шэсць груп наведвалі і слухалі лекцыі, актыўна рыхтаваліся да семінарскіх заняткаў, пропускі заняткаў былі выключэннем. Неабходна адзначыць, што грамадскія арганізацыі факультэта, дэканат многае зрабілі для высокай арганізацыі навучальнага працэсу. Цяжка выдзеліць сярод хімікаў тых, хто адказваў лепш за іншых. Іх многа. Можна назваць такія імёны, як Н. Гулько, А. Давідоўская, Г Закрэўская, С. Дзмітрыеў і многа іншых. Як правіла, іх адзнака на экзаменах не адрознівалася ад той, якую яны атрымлівалі на семінарскіх занятках. Многія студэнты добра папрацавалі. Напрыклад, нялёгка даваўся атэізм С. Паўловічу, І. Шусту, але яны ліквідавалі прабелы і змаглі атрымаць добрыя адзнакі на экзамене. Асабліва хочацца адзначыць той факт, што многія камсамольцы-трэцякурснікі засталіся незадаволенымі адзнакай «добра», а прасілі дазволу пераздаць на выдатна. І яны дасягнулі свайго, напрыклад, В. Межанцаў і іншыя. Адным словам, вынікі добрыя. Малайцы хімікі!

...І вось мы прысутнічаем на першым экзамене ў студэнтаў трэцяга курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры. Яны таксама здаюць асновы навуковага атэізма, таму ж выкладчыку. Адзін за другім адказваюць студэнты. Адчуваецца слабая падрыхтоўка, слабыя веды. Не засвоены асноўныя палажэнні дысцыпліны, слаба ведаюць работы класікаў марксізма-ленінізма аб рэлігіі. Мала добрых адказаў, большасць—шэрыя, пасрэдныя. Бываюць і правалы. З 66 тых, хто здаваў, на здавальняюча адказалі 19 чалавек, два атрымалі «нездавальняюча», «выдатна»—17 чалавек. Параўноўваючы вынікі экзаменаў у хімікаў з адзнакамі філолагаў, прыходзіш да сумных вынікаў. У чым справа? Сакрэт просты Мы прааналізавалі наведванне практычных заняткаў філолагаў і іх адказы. І што ж атрымалася? З трох семінарскіх заняткаў тры групы філолагаў (66 чалавек) прапусцілі 96 гадзін; толькі адна другая група (24 чалавекі. Групкамсорг Т. Сербантовіч) прапусціла 36 гадзін, у той час як усе шэсць груп хімікаў (138 чалавек) прапусцілі 24 гадзіны. Такія студэнты, як А. Камароўскі, М. Дабрыян, І. Клімянкоў і іншыя не прысутнічалі зусім на семінарскіх занятках. Не дзіўна, што яны з цяжкасцю на экзамене адказалі на здавальняюча. Не паказваюць прыклад у вучобе і дысцыпліне актывісты курса. Здавальняючыя адзнакі атрымалі члены бюро курса Л. Шафранкоў, які не рыхтаваўся да семінарскіх заняткаў, а групкамсорг Т. Сербантовіч атрымала «нездавальняюча», паказаўшы сваю поўную непадрыхтаванасць. Дарэчы, яна спрабавала карыстацца кнігай на экзамене, за што і была «папрошана» з аўдыторыі. І няма нічога дзіўнага, што група больш за ўсіх атрымала здавальняючых адзнак—7. Цікава, ці ведае камітэт камсамола факультэта аб такім асабістым прыкладзе сваіх актывістаў?

Нельга сказаць, што ўсе філолагі-трэцякурснікі беларускага аддзялення паказалі падобныя веды. Былі і добрыя адказы: Ж. Ляпешка, Л. Гаварушка, Л. Брыгадзіна, Л. Разневіч і іншыя, але іх было мала. Першы экзамен! Вынікі яго павінны насцярожыць усе грамадскія арганізацыі філфака. Неабходна зрабіць усё, каб такія справы не сталі нормай пры далейшай здачы экзаменаў.

*І. РЭКУЦ.*

# ТУТ ВАС ЧАКАЮЦЬ

**У час экзаменацыйных сесій напружаны рытм характарызуе і работу кабінетаў пры кафедрах. Заўсёды заняты рабочыя месцы ў кабінеце гісторыі КПСС. Студэнты першага і другога курсаў напорыста рыхтуюцца да залікаў і экзаменаў. Тут заўсёды можна знайсці неабходную літаратуру, свежыя часопісы і газеты. Ёсць у наяўнасці пытанні да экзаменаў і дзяржэкзаменаў, праграмы па курсу гісторыі КПСС.**

Асабліва многа цяпер працы ў загадчыка кабінета Івана Андрэевіча Гарбалені. У кабінет прыходзяць не толькі малодшакурснікі, але і дыпломнікі. Адным патрэбна ўзяць неабходную кнігу, іншым параіцца аб падборы літаратуры да дыпломных работ. Многа клопатаў у Івана Андрэевіча і з завочнікамі, якім даводзіцца падчас цярпліва адшукваць неабходную літаратуру па той ці іншай тэме.

Акрамя патрэбных кніг і брашур, у кабінеце ёсць 18 альбомаў па гісторыі КПСС, плакаты па тэмах вучэбнай праграмы, стэнды з матэрыяламі XXIII з'езда КПСС, фотадыяграмы.

Нядаўна кабінет набыў магнітафон, і студэнты атрымалі магчымасць праслухоўваць запісы прамоў У. І. Леніна.

Аднак у рабоце кабінета ёсць і цяжкасці. Кабінет валодае параўнальна невялікай рабочай плошчай. Неабходна яшчэ памяшканне для тэхнічных сродкаў навучання, пакой для выдачы кніг.

**Н. БЕЛАВУС,**
**А. ТОЗІК,**
**А. РАМАШОЎ.**
**студэнты гістфака.**

# АДЗІНАЯ Ў САЮЗЕ

Яшчэ адну кніжку атрымалі нашы студэнты. У выдавецтве «Вышэйшая школа» выйшаў «Практычны дапаможнік па бактэрыяфагіі». Такога роду кніжка — першая і адзіная, выдадзеная ў Саюзе. У ёй сабраны звесткі, што датычаць методыкі ўсебаковага даследавання вірусаў бактэрый (фагаў). Тут класічныя метады, вядомыя з кнігі М. Адамса «Бактэрыяфагі», і зусім новыя, стаўшыя актуальнымі ў самы апошні час.

Як пішуць аўтары, кніга «Задумана ў асноўным як дапаможнік пры выкананні практычных работ па раздзелу «Бактэрыяфагія», а таксама для выкарыстання ў самастойнай працы студэнтаў. Але задача кнігі намнога шырэйшая. Яна з'явіцца не толькі дапаможнікам для студэнтаў-біёлагаў, але і карысным дарадчыкам фізікам, што спецыялізуюцца па біяфізіцы. Многа карыснага знойдуць у ёй аспіранты, выкладчыкі — усе, хто цікавіцца маладой і захапляючай навукай — бактэрыяфагіяй.

Кніга мае 13 глаў, акрамя ўводзін. У пачатку кожнай з іх даецца кароткі тэарэтычны ўступ, характарызуюцца бактэрыялагічныя вірусы, якія найбольш часта ўжываюцца ў якасці аб'екта даследавання, ацэньваюцца розныя метады работы з імі.

Для выкладчыкаў у канцы кнігі рэкамендуюцца тэмы практычных заняткаў па спецкурсу «Бактэрыяфагія». Прыведзены таксама рэцэпты найбольш распаўсюджаных пажыўных асяроддзяў для вырошчвання бактэрый — гаспадароў фагаў. Спіс літаратуры (асноўнай і дадатковай) дапаможа студэнтам арыентавацца пры выкананні не толькі практычных работ па спецкурсу, але і дыпломных і курсавых работ.

Застаецца назваць аўтараў цікавага дапаможніка. Амаль усе яны супрацоўнікі універсітэта. Гэта І. М. Габрыловіч, В. С. Палупанаў, С. Б. Стэфанаў, Н. В. Батурыцкая, А. А. Кукулянскі, Н. І. Анісімава і С. І. Лукельева. Агульную рэдакцыю зрабіў старэйшы навуковы супрацоўнік БДУ кандыдат медыцынскіх навук Ісаак Майсеевіч Габрыловіч.

**Н. РУДЗІЧ.**



Гарачая пара сесіі прыйшла на фізфак.
НА ЗДЫМКУ вы бачыце студэнта чацвёртага курса Г. СІЦКО, які здае экзамен выкладчыку А. Ф. Шылаву. Фота І. Аскіркі.

# АПОШНІ ЭКЗАМЕН

Май быў самым гарачым месяцам для выпускнікоў факультэта журналістыкі. Абарона дыпломных работ. У адзін з апошніх майскіх дзён мы пабывалі на факультэце. Калі стрэлка гадзінніка ў вестыбюлі гуманітарнага корпуса падкралася да 9, у аўдыторыі паставілі апошні стул, налілі вады ў графін. Роўна ў 9 дзяржаўная камісія заняла свае месцы.

Старшыня глядзіць у спіс і выклікае:

— Марціновіч.

Да кафедры падыходзіць высокі стройны юнак і чуць усхвалявана пачынае:

— Тэма маёй дыпломнай работы «Якуб Колас — публіцыст». Праца складаецца з уводзін і двух раздзелаў...

А. Марціновіч коратка расказвае змест работы, адказвае на пытанні камісіі.

А затым рэцэнзент гаворыць аб станоўчых і адмоўных якасцях работы. Ацэньвае яе на добра.

Вось чарга даходзіць да студэнта стацыянара Юрыя Агараднічэнкі. Ён выбраў прадметам вывучэння гісторыю універсітэцкай шматтыражнай газеты. Выпускнік абараняецца ўпэўнена, выдатна адказвае на ўсе пытанні камісіі. Рэцэнзент ацэньвае работу самым высокім балам...

А за дзвярыма тоўпяцца балельшчыкі. Гэта трэцякурснікі. У час перапынку яны віншуюць выпускнікоў, распытваюць, раяцца. Гэта ж ім на будучы год прыдзецца абараняцца.

Я папрасіў выпускніка вячэрняга аддзялення Мікалая Зянковіча, які выдатна абараніў творчую дыпломную работу, адказаць на некалькі пытанняў, якія зацікавяць будучых дыпломнікаў.

— Якую тэму дыпломнай работы Вы выбралі і чаму?

— «Нішто не забыта, ніхто не забыты!»

Чаму я ўзяў гэту тэму? Па-першае, з-за яе вялікай грамадскай значнасці. Па-другое, тэма ваенна - патрыятычнага выхавання моладзі — як бы гэта больш сціпла сказаць — мая тэма. Паспрабую растлумачыць. Мы, пачынаючыя журналісты, пішам аб усім. Некаторыя ганарацца, маўляў: «На любую тэму пісаць магу!» Не трэба пісаць на любую тэму. Трэба пісаць на сваю, вывучыўшы яе дасканала і кожны дзень папаўняючы яе новымі матэрыяламі.

Першыя матэрыялы пра невядомых герояў я апублікаваў у 1963 годзе. І вось ужо пяты год галоўнай, вядучай у маёй рабоце з'яўляецца тэма народнага подзвігу.

— Колькі часу адведзена Вам на дыпломную работу? Ці дастаткова яго для творчай распрацоўкі тэмы? Калі канкрэтна прыступілі Вы да работы над дыпломнай?

— Калі паўстала пытанне аб выбары тэмы дыпломнай работы, я без ваганняў выбраў тую, над якой працую з другога курса. Вось чаму мне цяжка гаварыць пра час, адпушчаны на падрыхтоўку дыпломнай. Зрэшты, калі пытанне датычыцца тэарэтычнай часткі, то можна назваць дакладную дату — 8 красавіка. А над некаторымі матэрыяламі, у асноўным апублікаванымі «Чырвонай зменай», я пачаў працаваць яшчэ два гады назад. У прыватнасці, такая гісторыя нарыса «Міна для Готберга», які выйшаў у зборніку «Юнацтва баявое». Два гады шукаў я падрабязнасці подзвіга адважнай гераіні Надзі Маісеевай, якая здзяйсніла аперацыю па знішчэнню другога гаўляйтэра акупіраванай Беларусі — Готберга. Чатыры разы выступаў у газеце, пакуль не сабраў патрэбны матэрыял. Тое ж самае можна сказаць і пра іншых герояў. Я ўжо гаварыў пра дас'е журналіста па галоўнай тэме яго творчасці. Асабіста я з другога курса пачаў збіраць усё, што датычыцца ваенна - патрыятычнага выхавання: пастановы ЦК КПСС і ЦК ВЛКСМ, газетныя і часопісныя выразкі. Вось чаму цяжкасцей пры падрыхтоўцы дыпломнай работы ў мяне не было.

— Ад каго Вы атрымлівалі кансультацыі?

— Вялікая заслуга ў поспеху маёй дыпломнай работы навуковага кіраўніка М. А. Сушы, які пракансультаваў мяне яшчэ да пачатку работы над дыпломнай, даў некалькі важных парад па пабудове тэарэтычнай часткі, зрабіў некалькі заўваг па яе чарнавому варыянту. Гэта была каштоўная дапамога, і я вельмі ўдзячны яму.

— Некаторыя студэнты лічаць, што творчую работу напісаць лягчэй, чым тэарэтычную. Якая ваша думка? Раскажыце аб працэсе работы над матэрыяламі. Што Вы можаце прапанаваць нам, будучым дыпломнікам?

— Справа не ў тым, што лягчэй. Галоўнае, каб тэма была блізкай і дарагой. Тады можна пераадолець любыя цяжкасці. Мне, напрыклад, каб напісаць адзін нарыс «Баявая жамчужына арміі», прыйшлося пабываць не толькі ў воінскай часці, але і сустрэцца з доктарам гістарычных навук, прафесарам Іркуцкага універсітэта І. І. Кузняцовым, прачытаць многа мемуарнай літаратуры, звярнуцца ў архіў Міністэрства абароны СССР, сустрэцца і пагутарыць з дзесяткамі людзей з розных куткоў рэспублікі. Але гэта не ўсё. Наперадзе была задача вялікай цяжкасці — напісаць 50-гадовую гісторыю воінскага злучэння, выбраць са шматлікіх лёсаў самыя яскравыя, самыя тыпічныя.

Можна, вядома, напісаць добрую тэарэтычную работу і дрэнную творчую і наадварот. Усё залежыць ад падрыхтоўкі, ад таго, ці адчуў матэрыял сэрцам. Але я — за добрую творчую. Менавіта яна паказвае, што дыпломнік прапаноўвае дзяржкамісіі свой жанр, сваю тэму. А яе патрэбна шукаць не ў рэдакцыі пасля абароны дыпломнай, а ўжо на першым—другім курсах — вось лепшая парада будучым дыпломнікам.

М. САЛАВЕЙ,
студэнт III курса журфака.

## НА ПАДРЫХТОЎЧЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ



У час апошніх заняткаў. Фота І. Аскіркі.

# КАБ АВАЛОДАЦЬ МОВАЙ ЛЕНІНА

Выязджаючы на вучобу ў СССР, Хоанг Ван Шон атрымаў наказ бацькі: «Я хачу, каб ты добра вывучыў мову Леніна. Гэта паможа табе стаць добрым спецыялістам і прынесці сваёй Радзіме вялікую карысць».

Шон выканаў наказ бацькі. Цяпер ён выкладае ў Ханоі. У яго вельмі многа работы, але ён знаходзіць час пісаць сваім выкладчыкам вялікія пісьмы. І амаль у кожным з іх шчырыя прызнанні: «Я вельмі сумую па Савецкаму Саюзу, па Мінску, па ўсіх выкладчыках універсітэта і па рускай мове».

Так, той, хто з такой цяжкасцю авалодаў рускай мовай, адчуў яе прыгажосць і багацце, не можа не любіць яе.

Многа падобных пісьмаў атрымліваюць нашы выкладчыкі. Многа, таму што за сем год існавання падрыхтоўчага факультэта БДУ яго закончылі звыш 500 чалавек.

Амаль усе з іх вучацца ў інстытутах і універсітэтах краіны або ўжо закончылі іх і з поспехамі працуюць у сябе на Радзіме. За гады вучобы ў СССР яны не толькі добра авалодваюць выбранай спецыяльнасцю, але і рускай мовай. На падрыхтоўчы факультэт, як правіла, прыязджаюць людзі, якія ні слова не ведаюць па-руску. Задача выкладчыка заключаецца ў тым, каб навучыць студэнта ўжо праз два-тры месяцы весці простую гутарку на бытавыя тэмы, разумець нескладаную мову рускага чалавека. Акрамя таго, за гэты невялікі перыяд наш студэнт павінен быць падрыхтаваны да заняткаў па матэматыцы, фізіцы, хіміі, гісторыі СССР, якія вядуцца толькі на рускай мове.

Той, хто закончыў падрыхтоўчы факультэт, павінен быць здольным разам з савецкімі студэнтамі слухаць і разумець лекцыі, умець канспектаваць праслуханае і прачытанае.

Задача складаная, і таму ўся вучэбная, выхаваўчая і метадычная работа факультэта накіравана на яе выкананне.

Кіраўніцтва факультэта прыкладае вялікія намаганні для паляпшэння забяспечанасці вучэбнага працэсу тэхнічнымі і наглядными сродкамі. Так, на факультэце ёсць фанетычны кабінет і нядрэнная фанатэка з запісамі неабходных нам тэкстаў, дыялагаў, практыкаванняў, матэрыялаў для канспектавання.

У кабінеце методыкі рускай мовы падабрана многа вучэбных і сюжэтных карцін і дыяфільмаў, якія таксама шырока выкарыстоўваюцца намі на ўроках. Вельмі дапамагаюць нам у працы агляды і абмеркаванні навінак метадычнай літаратуры, якія сістэматычна праводзяцца кафедрай рускай мовы.

Жывуць студэнты падрыхтоўчага факультэта разам з савецкімі студэнтамі. Гэта акалічнасць садзейнічае паспяховай вучобе нашых студэнтаў, якія маюць пастаянную магчымасць і ў сваім пакоі слухаць рускую мову і гаварыць па-руску, бліжэй пазнаць нашых людзей. Сярод савецкіх студэнтаў, што жывуць разам з замежнай моладдзю, нямала слаўных хлопцаў і дзяўчат, якія заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу сваім сябрам. Мы не ведаем ні аднаго выпадку, калі б савецкі студэнт адказаў у дапамозе свайму таварышу. Дружба, якая існуе паміж імі, радуе нас, і мы імкнемся ўмацоўваць яе.

Шырокае кола пытанняў, з якімі даводзіцца сустракацца выкладчыкам нашага факультэта. Не заўсёды гэта простыя пытанні. Але заўсёды мы памятаем, што за кожным з іх стаіць чалавек, якога мы павінны навучыць рускай мове, якому мы павінны дапамагчы пазнаць і палюбіць народ, што валодае гэтай вялікай мовай.

Р. УЛЬЯНКА,
выкладчык рускай мовы.



Наш фотакарэспандэнт І. Аскірка зазняў студэнта Чан Хыу Фук каля дошкі, дзе ён выводзіць хімічную формулу.



Настрой у гэтых юнакоў бадзёры: яны толькі што здалі залік па адной з нялёгкіх дысцыплін — па рускай мове. Пасля кароткага адпачынку іх чакаюць экзамены.

# ПРАЦОЎНЫ СЕМЕСТР КЛІЧА

Звычайна размову пра студэнцкія будаўнічыя атрады пачынаюць з рамантыкі, палатак. Гэта так. Заўсёды ў гутарках успамінаюць тыя моманты, калі ўпершыню трымалі ў руках кельму, стаялі спазаранку на лінейцы, успамінаюць дні прыезду і знаёмства з новымі мясцінамі. Але за ўсім гэтым адчуваннем стаіць фізічная праца. Часам мы атаесамляем фізічную працу і фізічнае выхаванне. Сфарміравалі атрад і лічым працу закончанай, адправілі студэнтаў на будоўлю і супакоіліся. А калі справа ў атрадах не арганізавана, то не любоў да працы выхоўваем, а раўнадушша, а ў некаторых выпадках нават непавагу да яе.

Студэнцкія атрады і іх арганізацыя — не простая справа і не кампанія. Імі патрэбна займацца сур'ёзна, умела прапагандаваць атрады і навукова прагназаваць іх развіццё. У гэтым руху студэнцкай моладзі адкрываюцца і атрымліваюць развіццё многія элементы тэорыі камуністычнага выхавання, педагогікі, сацыяльнай псіхалогіі, этыкі і маралі.

Студэнцкія атрады на цаліне і ў Беларусі, якія будуюць жылыя дамы, школы, дамы культуры, сельскагаспадарчыя памяшканні, электрыфікуюць пасёлкі—калектыў своеасаблівы, яго фарміраванне не павінна адбывацца стыхійна, калі хочам свядома вызначыць яго выхаваўчыя задачы.

Як складаецца атрад зараз? Вядомы фронт будучых работ. Ён патрабуе, напрыклад, 10 муляроў, чатырох штукатураў, двух цесляроў і г. д. Гэта вытворчая характарыстыка. Падбор членаў атрадаў ідзе менавіта з такім улікам.

Вядомы і другія задачы будаўнікоў: агітацыйна-прапагандысцкая работа, стварэнне піянерскіх лагераў-спадарожнікаў пры атрадах і г. д. І ў атрад падбіраецца 7—10 арганізатараў і ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці, 4—5 лектараў, 2—3 мастакі, 4—5 кіраўнікоў спартыўных і розных дзіцячых гурткоў. Калі ўсё гэта зроблена разумна, з улікам розных задач, якія стаяць перад будучым калектывам, атрад будзе жыць цікавым і шматгранным жыццём.

Студэнцкія атрады — не толькі масавыя, але і дастаткова спецыялізаваныя калектывы. Усё больш разумна спалучаюцца ў іх арганізацыя і выкарыстанне прафесіянальнай арыентыроўкі будучых спецыялістаў. Ёсць атрады энергетыкаў, атрады культуры. Умела спалучаюць работу ў атрадзе з грамадскімі даручэннямі юрысты, гісторыкі, філолагі. Хоць атрады і застаюцца агульнабудаўнічымі, яны зробяць сур'ёзны ўплыў не толькі на фарміраванне асобы студэнтаў, але і на больш глыбокае разуменне сваёй будучай спецыяльнасці.

Студэнцкае самакіраванне. У вучэбных семестрах— гэта размеркаванне стыпендыі і месц у інтэрнаце, на будоўлях студэнты самі вызначаюць аб'екты работ, заключаюць працоўныя дагаворы, сочаць за іх выкананнем, будуюць памяшканні, размяркоўваюць абавязкі паміж членамі атрада. Разам з гэтым у студэнтаў накапліваецца вопыт арганізацыйнай і гаспадарчай работы.

Зараз ніхто не адмаўляе эканамічную мэтазгоднасць і эфектыўнасць працоўнага ўклада студэнтаў. Наадварот, часам нават вельмі пераацэньваюць магчымасці: «студэнт усё зможа»! І ў аргумент прыводзяць лічбы. Успомнім, што ў 1967 годзе 40 атрадаў з БДУ засвоілі звыш мільёна рублёў капіталаўкладанняў. Вытворчыя магчымасці студэнцкіх атрадаў улічваюцца нават дзяржпланам.

У чэрвені 1963 года ўпершыню разам з іншымі атрадамі з Беларусі ва Уральскую вобласць прыехалі фізікі. З гэтага часу пачынаецца моцная дружба паміж нашымі студэнтамі і сельскагаспадарчымі калектывамі Казахстана. Праз два гады студэнцкія атрады выехалі на будоўлю рэспублікі. З кожным годам лік іх павялічваўся, і ўжо ў 1967 годзе ў працоўным семестры прымала ўдзел звыш паўтары тысячы студэнтаў.




*Гэта аб'ява, якая ўжо даўно заклікае універсітэцкае студэнцтва акунуцца ў рытм трэцяга працоўнага ударнага семестра, і сёння не мяняе сваёй сутнасці. Мяняецца толькі лічба. Нават цяпер, у гарачыя дні сесіі, яна напамінае аб не менш гарачым леце.*

У гэтым годзе рэспубліканскаму атраду, які налічвае звыш 15 тысяч членаў, прысвоена ганаровае званне — атрад імя 50-годдзя БССР і КПБ, а працоўны семестр, прысвечаны 50-годдзю БССР, Кампартыі Беларусі і 50-годдзю ВЛКСМ, абвешчаны ўдарным.

Сёлета універсітэт павінен сфарміраваць звыш 60 будаўнічых атрадаў, забяспечыць іх спартыўным інвентаром і канцылярскімі прыладамі. Таму вялікая адказнасць у час фарміравання гэтых атрадаў ляжыць на партыйных бюро і камітэтах камсамола факультэтаў.

У параўнанні з мінулым годам зараз павялічылася колькасць атрадаў, якія паедуць на будоўлі калгасаў рэспублікі і застануцца ў будаўнічых трэстах горада Мінска. Гэтым атрадам патрэбна ў тэрмін прайсці медыцынскі агляд, зрабіць неабходныя прывіўкі, праслухаць курс лекцый па тэхніцы бяспекі і здаць па ёй залік.

Асноўны склад гэтых калектываў — першакурснікі. У іх няма яшчэ арганізацыйнага вопыту, ім вельмі патрэбна дапамога з боку партыйных арганізацый. Але па невядомай прычыне дапамога камітэтам камсамола з боку партыйных бюро пакуль што мала адчувальная. Вынікам гэтага з'яўляецца вельмі нізкая працаздольнасць многіх атрадаў.

Філалагічны факультэт не падрыхтаваўся да правядзення працоўнага семестра. Пры камітэце камсамола не створан штаб працоўных спраў, адсутнічае наглядная агітацыя, студэнты мала інфармаваны аб задачах і ходзе фарміравання будаўнічых атрадаў.

Хочацца звярнуць увагу на фарміраванне атрадаў на юрыдычным, матэматычным і хімічным факультэтах. Магчымасці дазваляюць скамплектаваць больш працаздольных атрадаў.

Аб рабоце камітэта камсамола і штаба працоўных спраў фізічнага факультэта гавораць такія лічбы: Мінская вобласць — 12 атрадаў, Новалукомль — атрад электратэхнікаў, горад Мінск — 120 студэнтаў. Разам з гэтым праходжанне медыцынскага агляду студэнтамі фізфака не заслугоўвае пахвалы. Лепш ідуць справы з фарміраваннем і арганізацыяй цалінных атрадаў. Тут начале стаяць юнакі, у якіх за спіной не адзін год стажу на будоўлях Беларусі і Казахстана, якія пазналі крыху горкі і незабыўны прыкус гарачага студэнцкага лета.

У шосты раз будуць працаваць студэнцкія атрады універсітэта на будоўлях Казахстана, у чацвёрты выедуць у калгасы рэспублікі. Тут нараджаліся і ўзбагачаліся лепшыя традыцыі студэнцкага будаўнічага руху. Тут склалася прызнаная зараз усімі эфектыўная і своеасаблівая школа. У гэтай школе атрымала загартоўку не адно пакаленне камандзіраў, камісараў, майстроў.

**М. ШАВЫРКІН,**
**начальнік штаба працоўных спраў універсітэта.**

# ЗНАЙСЦІ СЯБЕ

**... Ад кастра россыпам соцен маленькіх камет аддзяляліся іскрынкі і ляцелі ўгару, між стромкіх сосн аў у фіялетавую бездань неба. Гукі гітары і песня зліваліся з таямніцамі ночы. Адразу прыпаміналіся кастры і песні — песні цаліны, гукі звонкага казахстанскага стэпу.**

**Ля гэтага кастра, непадалёк ад гасцініцы ў Стайках, сабраліся былыя і будучыя «зёзды» цаліны.**

**А на заўтра, раніцай — лінейка, рапарт камандзіра Уральскага абласнога штаба студэнцкіх будаўнічых атрадаў Васіля Чумакова, які прымала сакратар ЦК ЛКСМБ Н. С. Нерад.**

**Пачынаецца семінар камандзіраў будаўнічых атрадаў.**

**— Перш чым пачаць работу семінара, — сказала Н. С. Нерад, — дазвольце ад імя Бюро ЦК за актыўны ўдзел у рабоце студэнцкіх будаўнічых атрадаў уручыць беламу камандзіру Уральскага абласнога штаба Віктару Унуковічу Ганаровую грамату ЦК ВЛКСМ.**

**Пад гулкія апладысменты цалиннікаў Віктару Унуковічу, аспіранту Беларускага палітэхнічнага інстытута, перадаецца Ганаровая грамата і значок з залатой лаўравай галінкай.**

**... Справаздачы, анкеты, пратаколы пасяджэнняў штабаў, рапарты, розныя па форме, аднолькавыя па зместу: у іх планы і роздумы, вынікі і пажаданні на будучае, у іх жыццё будаўнічых атрадаў.**

**Падымаюцца і гавораць, садзяцца і зноў устаюць — ідзе семінар камандзіраў. Выступаюць «зёзды» цаліны і начальнікі — гэта Віктар Унуковіч, Васіль Чумакоў, Слава Власевіч, Валерый Сахновіч, Натан Велікові ч, Леанід Ціхановіч, Валянцін Гладышаў, Гера Дарогін і многія іншыя.**

**— Што мы павязем з сабой на будоўлі? — нібы пытае сябе і слухачоў камісар рэспубліканскага штаба Натан Велікові ч.**

**— Не толькі рыдлёўкі, сякеры і кельмы, але і канцэрты, лекцыі, кнігі, наш студэнцкі невычарпальны энтузіязм. Мы едзем не толькі будаваць. Мы вязем з сабой нашу палітыку і ідэалогію, пошук рамантыкі і імкненне знайсці сябе. Наша палітыка — гэта пабудаваныя дамы, масты, школы, яслі. Мы сваёй працай удзельнічаем у практычнай пабудове матэрыяльна — тэхнічнай базы камунізма. Лозунгам дня будзе — выхаванне нашай моладзі.**

**Да стала падыходзіць начальнік службы забеспячэння Ілья Аліппа. І адразу сыплецца мноства пытанняў: а як з цэглай! а як з лесам! з інструментам! У абласным штабе працуе служба забеспячэння — са сваімі законамі і прынцыпамі работы, з велізарнымі рэестрамі, з кіпамі інструкцый і накладных, у цэлым— сапраўднае студэнцкае міністэрства матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння.**

**«Здароўе народа — вышэй за ўсё», як гаварылі ў старажытнасці, так гавораць і зараз. У галоўнага ўрача Уральскага абласнога штаба Уладзіміра Піскунова ёсць што сказаць камандзірам атрадаў, а камандзірам у сваю чаргу запытаць у доктара аб розных пытаннях медслужбы.**

**Цаліна кожнага года адрозніваецца ад папярэдняй. Новыя дамы, лініі сувязі і новыя масты, вуліцы і зернясховішчы — гэта студэнцкія аўтографы на зямлі. Але яшчэ больш іх, мабыць, засталося ў людской памяці, у людскіх сэрцах. Гэта памяць ва ўсмешках дзяцей са студэнцкіх лагераў — спадарожнікаў, у пісьмах і тэлеграмах юных сяброў. Мінскія студэнты, якія паедуць на будоўлі краіны, вырашылі выдзеліць частку з зробленых сродкаў на пабудову Палаца моладзі ў Мінску.**

**Закончыўся семінар. Пачынаюцца новыя старонкі біяграфіі студэнцкіх будаўнічых атрадаў.**

**А. ПАЎЛЯНКОЎ.**






*НА ЗДЫМКАХ: (уверсе) сакратар ЦК ЛКСМБ Н. С. Нерад уручае Ганаровую грамату ЦК ВЛКСМ і камсамольскі значок з залатой лаўравай галінкай беламу камандзіру Уральскага абласнога штаба студэнцкіх будаўнічых атрадаў Віктару Унуковічу.*

*Унізе — Выхаваць будучага цаліннік а — нялёгка.*

*Фота У. ЯРМАЛОВІЧА і І. АСКІРКІ.*

## ІДЗЕ ПАПАЎНЕННЕ

*Яшчэ ў красавіку ва універсітэце пачала працаваць прыёмная камісія.*

*У яе абавязках прымаць і афармляць дакументы абітурыентаў, даваць даведкі, парады.*

*— Але нам даводзіцца не толькі афармляць дакументы,—гаворыць намеснік сакратара прыёмнай камісіі Г. Ф. Лутчанка.*

*— У нас ёсць лічба—800. Гэта столькі мы павінны прыняць на завочны факультэт абітурыентаў, і нам не абыякава, каго прыняць. Мы разаслалі ў раённыя аддзелы народнай асветы ўсіх вобласцей аб'явы аб правілах прыёму ва універсітэт з суправаджальнымі пісьмамі, у якіх прасілі, каб сярод моладзі была праведзена тлумачальная работа. Хутка мы атрымалі адказы, што наша просьба выканана, а аб'явы распаўсюджаны ў клубах, бібліятэках, школах, палацах культуры.*

*У гэтым годзе многа заяў у прыёмную камісію паступіла на філалагічны і біялагічны факультэты ад сельскай моладзі.*

*Хутка пачнуцца ўступныя экзамены. Дакладней, з 10 чэрвеня. Яны і пакажуць каго выбраць у лік 800 студэнтаў.*

*А. САГАЎ.*




В. М. Салдаткіна гутарыць з абітурыентам. Фота І. Аскіркі.

## ДА НОВЫХ СУСТРЭЧ

Вось ён, Брэст. Маленькі, ціхі гарадок, ахутаны зеленню. 25 мая тут адкрыўся традыцыйны фестываль «Брэсцкая вясна», на які былі запрошаны госці з Мінска, Луцка, Гродна, ганаровыя грамадзяне Брэста. Свята адкрылася ўрачыстым ускладаннем вянкоў на брацкую магілу. Затым у парку на адкрытай эстрадзе адбыўся вялікі канцэрт, у якім прымалі ўдзел ансамбль «Валынянка» з Украіны, «Нёман» з Гродна, танцавальны калектыў БДУ і Брэсцкі ансамбль «Радасць».

Удзельнікі фестывалю наведалі легендарную Брэсцкую крэпасць, пабывалі ў Белавежскай пушчы і ў музеях На стадыёне адбылося вялікае тэатральнае прадстаўленне. Удзельнікам фестывалю былі прыпаднесены каштоўныя падарункі. Жыхары Брэста ды і самі госці засталіся вельмі задаволены прайшоўшым фестывалем. Брастчанам вельмі спадабаліся выступленні танцавальнага калектыва і салістаў універсітэта, гарачымі апладысментамі былі су... рэты «Леткоўская к...рыль», «Украінскі танец». Жыхары Брэста былі ў захапленні ад песен, выкананых В. Мамінавым і Е. Елісеевым. Ва ўсіх на тварах свяціліся сяброўскія ўсмешкі. І нават сонца выглядала з-за хмар, калі на сцэне ў яркіх прыгожых касцюмах з'яўляліся нашы танцоры.

І вось фестываль закончаны. Пара ехаць дадому, у Мінск. Крыху сумна было развітвацца з Брэстам. Але мы спадзяемся, што ў будучым годзе зноў прымем удзел у фестывалі «Брэсцкая вясна», сустрэнемся з нашымі сябрамі з Луцка, Гродна, і зноў на тварах заіграюць цёплыя радасныя ўсмешкі! Да новых сустрэч!

**Т. ЛЕБЕДЗЕВА,**
салістка танцкалектыва.

# КАЛЯ СВЯШЧЭННЫХ МЕЖАЎ

**Ваенна-патрыятычнае выхаванне нашай моладзі набывае ўсё больш разнастайныя формы. Гутаркі і экскурсіі па месцах баявой і рэвалюцыйнай славы, тэматычныя вечары, падрыхтоўка спецыялістаў у тэхнічных гуртках — усё гэта садзейнічае духоўнай і фізічнай загартоўцы студэнцтва.**

**Нядаўна ў адным з цікавых паходаў пабывала група актывістаў абаронна-масавай работы. Сёння мы даем слова ўдзельніку гэтага незабыўнага падарожжа студэнту факультэта журналістыкі В. Тарасевічу.**

### ТАМ, ДЗЕ ПАЧЫНАЕЦЦА РАДЗІМА

Сцены гераічнай крэпасці засталіся далёка ззаду, а перад нашымі вачыма ўсё паўставалі зубчатыя абрысы на фоне блакітнага неба. Тады мы як зачараваныя глядзелі на панараму цытадэлі, якая адкрылася перад намі з галерэй паўразрушанай царквы — эліцэнтра былых баёў. Світанне майскага дня, якое разлілося каля Берынгава праліва, уставала над заходняй граніцай краіны, над Брэсцкай крэпасцю. Тут пачынаецца Савецкая зямля, пачынаецца тое, што мы называем Радзімай.

### ЗАХОДНІЯ ВАРОТЫ КРАІНЫ

Пяцьдзесят студэнтаў універсітэта сустракалі гэтую раніцу каля свяшчэнных сцен крэпасці. Для нас паездка ў Брэст была не толькі заахвочваннем за поспехі ў вучобе. У нашай памяці яна застанецца як падзея ў студэнцкім жыцці, поўная яркіх незабыўных уражанняў.

Брэст нас сустрэў квеценню вішань і сакавітай зелянінай сквераў. З ценістых алей парка мы звярнулі на вуліцу Міцкевіча. Каля бюста вялікага польскага паэта — дрэва з выцягнутай уверх кронай. З першага погляду — звычайны перамідальны топаль. Але прыгледзеўшыся, адрозніваем незвычайную форму лісця «топаля». Пераміďальны дуб — даволі рэдкая парода дрэў у СССР. Спецыялісты сцвярджаюць, што такіх дрэў у нас толькі адзінкі.

Будучыя біёлагі з зацікаўленасцю разглядаюць дрэва, нехта ўжо шчоўкае затворам фотаапарата.

Брэст больш старажытны за многія рускія гарады, вядомыя сваёй даўняй архітэктурай і захаванымі помнікамі. Але тут вы не ўбачыце гэтыя дарагія нашаму сучасніку рысы мінулых стагоддзяў. Горад не раз зруйноўвалі з зямлёй літоўскія, польскія і іншыя захопнікі: Брэст стаяў на граніцы старажытнай Русі.

Але ў Брэста ўсё ж ёсць сваё аблічча. Нам запамятаўся яго вялікі вакзал, прасторная цэнтральная плошча, нядаўна ўзведзены будаўнічы інстытут — адзін з самых прыгожых будынкаў у горадзе. Запомніліся гутаркі на розных мовах: горад кожны дзень сустракае і праважае тысячы замежных турыстаў — гасцей Краіны Саветаў. Нездарма Брэст называюць заходнімі варотамі СССР.

### У КРЭПАСЦІ

Другі дзень нашага знаходжання ў Брэсце мы прысвяцілі легендарнай крэпасці. Нашаму кіраўніку выкладчыку М. Е. Бондару не прышлося доўга шукаць экскурсавода. Дзяўчына, даведаўшыся, што мы з БДУ, адразу ж згадзілася правесці нас па залах музея.

Знаёмімся. Тоня Клімчанка вучыцца на гістарычным факультэце нашага універсітэта. Студэнтка-завочніца цудоўна авалодала мастацтвам экскурсавода. Расказваючы аб экспанатах Музея абароны Брэсцкай крэпасці, яна выдзяляе самае галоўнае, астаўляе нам час лепш прыгледзецца да фатаграфій герояў абароны, разгледзець іх зброю і надпісы на сценах — скупыя радкі, у якіх адчуванне выкананага салдацкага доўгу. Вось адна з іх: «1941 год 26 чэрвеня. Нас было трое, нам было цяжка, але мы не ўпалі духам і паміраем як героі».

Расплаўленыя палаючым фугасам цагліны, і на іх — гэтыя надпісы. Кажуць, у музеі Хірасімы ёсць кусок сцяны, на якім ад чалавека засталася толькі цень, слабы сілуэт ахвяры атамнай бамбардзіроўкі. Па-рознаму загінулі тыя трое і жыхар Хірасімы...

Будзільнік. Стрэлкі застылі, ужо 27 год паказваючы пачатак пятага. 27 год гераічнай абароне на берагах Буга.

«Рускія ў Брэст-Літоўску змагаліся выключна ўпарта і настойліва, яны паказалі выдатную вывучку пяхоты і даказалі сапраўдную волю да перамогі», — пісалі ў сваіх данясеннях афіцэры 45 пяхотнай дывізіі нямецка-фашысцкай арміі. Многія салдаты гэтай дывізіі, якія прайшлі парадным шагам праз Трыумфальную арку ў Парыжы, так і не змаглі прайсці праз Холмскія вароты ў Брэсце.

Мы яшчэ раз абходзім цытадэль. Забіраемся ў адзін з казематаў. Праз амбразуру відаць выгіб ракі, супрацьлеглы бераг, зарослы кустамі.

### У ПУШЧЫ

Белавежская пушча рэдкае па прыгажосці месца ў нашым лясным краі. Пранізаныя сонечнымі праменнямі сасновыя бары і вясёлыя карагоды бяроз, грабавыя насаджэнні, густыя зараслі ёлак — усё гэта можна бачыць на параўнальна невялікай плошчы. На тэрыторыі пушчы — музей прыроды. Дзівосна зроблены чучалы птушак, аленяў, рысей. Нібы жывы стаіць у канцы калідора зубр. Ну як не сфатаграфавацца разам з лясным веліканам!

Зрэшты, бачылі мы і жывых зубраў. Нібы прыйшоўшыя з другой эпохі, жывёлы здзіўляюць сваёй магутнасцю. Нездарма фігура зубра ўпрыгожвае беларускія МАЗы і БелАЗы як сімвал магутнасці і вынослівасці.

Зубры не збіраліся нам пазіраваць, а фатографам удалося ў апошні момант зазняць іх, велічна накіраваных у родную пушчу.

Савецкая дзяржава выратавала гэты дзівосны куток прыроды ад знішчэння. Цяпер пушча стала запаведнікам-пітомнікам, з якога ва ўсе канцы краіны і за граніцу вывозяць рэдкія пароды жывёл.

Развітваючыся з пушчай, кладзем кветкі на брацкую магілу. І тут змагаліся савецкія воіны, стаялі на смерць, абараняючы родную зямлю.

**В. ТАРАСЕВІЧ.**

# Як здаць экзамен

## Тры варыянты, прапанаваныя гумарыстам

# КОМПЛЕКС ПАЎНАЦЭННАСЦІ

**Увесь комплекс паўнацэннасці студэнта можна заўважыць толькі на экзаменах. Гэта сапраўды асляпляльнае па сваёй прыгажосці відовішча. На вялікі жаль, улюбёны прыём — плач, які перарываецца воклічам: «Прафесар, спытайце яшчэ чаго-небудзь», — у апошні час пачаў рэдка прыводзіць да поспеху.**

**Гэтыя сумныя абставіны прымусілі аўтара заняцца распрацоўкай новых варыянтаў.**

*ВАРЫЯНТ № 1*




(Глядзіце на выкладчыка вачыма, «раскрытымі ў свет»).

— Што з вамі, Іванова?

— У мяне, бачыце, сёння вяселле...

(Голасам пяшчотным і заміласаваным, як Ія Савіна ў фільме «Дама з сабачкай»).

— Ах, вось яно што, віншую!

— Дзякую, я так хвалююся... (...як Ія Савіна).

— Ну навошта ж хвалявацца, бярыце білет, сядайце.

— Што вы! Я лепш пастаю.

— Навошта ж стаяць, сядайце.

— Дзякую, вы такі добры (...як Ія Савіна).

— Першае пытанне. Тэорыя адноснасці Эйнштэйна (усё роўна, якое пытанне).

— Дзякую, такое лёгкае пытанне, але мне чамусьці хочацца плакаць.

— Ды што з вамі, галубка?

— У мяне, бачыце, сёння вяселле, і я так хвалююся...

— Ах, так-так-так. Ну паспрабуем другое пытанне...

— Дзякую, я і на другое не адкажу (...як Ія Савіна).

— Гм.. А хто ваш будучы муж?

— Ён, як і вы, фізік, (хімік, лірык, гледзячы што здаеце). Усе гавораць, ён здольны фізік.

— Ён вас рыхтаваў да экзамена?

— Так... мы з ім, асабіста кажучы, і пасябравалі, таму што абодва любім фізіку (...як Ія Савіна).

— Ну тады вось хоць трэцяе пытанне.

— Я толькі аднаго баюся, каб шлюб не пашкодзіў мне любіць фізіку.

— Усё залежыць ад вас...

— Калі я сёння атрымаю двойку, у загс не пайду... Каму я такая патрэбна?

— Ну гэта вы дарма... супакойцеся... усё будзе добра.

— Я спадзяюся на вас!

— Добра-добра, я вам пастаўлю здавальняюча.

— За што? (Сваім голасам).

— Але вышэй я вам не магу паставіць.

— А вы паспрабуйце! (Не сваім голасам).

— ...?!!

— Прафесар, больш за ўсё баюся, каб шлюб не пашкодзіў мне любіць фізіку (...як Ія Савіна).

(І г. д., пакуль не атрымаеце «выдатна»).

*ВАРЫЯНТ № 2*



(Вы прастадушнейшы, наіўнейшы чалавек на свеце).

— Малады чалавек, вы не ведаеце ні-чо-га...

— Хто б мог падумаць?! (Маленькая пауза)... А я вас памятаю.

— Што вы кажаце!

— Так.

— Пасля ўчарашняй кансультацыі?

— Не, з ранняга дзяцінства, калі я быў зусім малюсенькім і вы мяне на каленях качалі.

— Але чамусьці я не памятаю гэтага.

— Ну як жа! Яшчэ бацька увесь час пытае: «Чаму Лёня не зойдзе?».

(Трэба абавязкова ведаць, як завуць выкладчыка).

— Цікава...

— Вельмі!

— Як ваша прозвішча?

— Іваноў. Бацьку завуць Мікалай Пятровіч.

— Не памятаю.

— Вы з ім вучыліся разам.

— Дзе?

— У першым класе.

— Магчыма, магчыма...

— Вось я і думаю...

— Што?

— Магчыма? (Працягваеце залікоўку).

— Іваноў?

— Іваноў.

— Ну добра, бярыце яшчэ адзін білет.

— А раптам хлопцам не хопіць!

— Я пра іх сам паклапачуся.

— Так?

— Але.

— Чаго, кажа, Лёня не зойдзе? Зайшоў бы на самай справе.

— Іваноў?

— Мікалай Пятровіч.

(Не выходзьце да той пары, пакуль не атрымаеце патрэбнай адзнакі).

*ВАРЫЯНТ № 3*

(Старайцеся быць падобным на чалавека шчырага).

— Вы або здзіўляюча бяздарны або страшэнна лянівы.

— Двойка?

— Так.

— Дзякую! Дзякую, Алег Міхайлавіч!

— За што?!

— Ну як жа! Мяне цяпер з інстытута выганяць!

— Раней трэба было думаць! І ўвогуле... паклічце наступнага.

— А як я ў інстытут паступіў? Малады быў, ну сябры і падбілі.

— Значыць, вы шкадуеце, што паступілі ў інстытут?

— А вы не? Не трэба, Алег Міхайлавіч, душой крывіць. Чалавек народжаны, каб жыць. А мы тут мазгі ломім.

— Дык вы не хочаце ламаць?

— Не хачу.

— З ветрам дарога.

— Дзякую. У нас на курсе такіх, як я, многа. Даведаюцца, што вы адабраеце, таксама кінуць.

— Чаму ж вы думаеце, што я адабраю?!

— А як жа... Пяць дзён назад ужо я прасіў прафесара Мішкіна: «Адпусціце». «Не, — кажа, — я ведаю, ты разумнік, толькі табе дурасць у галаву стукнула, але ты не думай што патураць гэтаму буду. Я цябе сілай прымушу інстытут закончыць». І паставіў пяцёрку. Ну хіба ж гэта сябра? Хіба ж гэта настаўнік?

— Тое ж яно...

— Я да рэктара, а той кажа: «Правільна Мішкін паступіў. Сапраўдны педагог!»

— Вядома, правільна.

— Вось вам і даверся. Апошняя надзея рухнула... Відаць, прыдзецца давучвацца...

— А ты як думаў... шчанюк? Ідзі, пяць!

Так з году ў год, шліфуючы старыя і набываючы новыя варыянты, вы падыйдзеце да абароны дыплома. Спецыяліст з вас атрымаецца, мякка кажучы, — «ні богу свечка, ні чорту качарга». Але ж ці гэта прычына для засмучэння?

**А. ТРУШКІН.**
(«Неделя» № 23 (431). 1968 г.).

**Адказны рэдактар М. ІОСЬКА.**

Зак. 871. АТ 02243 Адрас рэдакцыі: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон—Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда».